*Рыгор Шаура,*
*кандыдат мастацтвазнаўства*

# ТВАРЫЦЬ СВОЙ СВЕТ ЗМЯСТОЎНЫМ І ПРЫГОЖЫМ...

**Нататкі пра жыццё і творчасць Міхася Засінца**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Жывапіс Міхася Засінца — гэта цэлая з'ява ў мастацкай культуры нашай рэспубліке. Пройдзе час, і яго творы будуць згадвацца ў гісторыі мастацтва поруч з творамі Анры Русо і Пірасмані.

Усё жыццё самабытнага беларускага мастака прайшло ў вёсцы Мядзведнае Ельскага раёна Гомельскай вобласці. Тут у 1935 годзе ён нарадзіўся, тут спазнаў нялёгкую працу земляроба. М. Засінец араў саўгаснае поле, сеяў і збіраў хлеб, нарыхтоўваў корм жывёле. Быў добрым механізатарам. Да яго, перадавіка вытворчасці, не раз звярталіся за парадай аднавяскоўцы, таварышы па працы. Але нечакана ў жыцці М. Засінца ўсё парушылася. Невылечная траўма зрабіла чалавека нерухомым. Усяго толькі 35 гадоў, і назаўсёды — ложак... Знайсці сваё месца ў жыцці дапамаглі кнігі, і перш за ўсё «Як гартавалася сталь» М. Астроўскага. Міхась Засінец успомніў, што ў школе няблага пісаў сачыненні, любіў маляваць. Пачаў пісаць артыкулы ў газету, рабіць замалёўкі... З'явіліся першыя «заказы» аднавяскоўцаў. Адны прасілі намаляваць лебедзяў на возеры, другія — заморскіх птушак, ды так, каб было прыгожа, «маляўніча»... Дзесяткі кампазіцый на цыраце мастак падарыў таварышам, суседзям. Людзям падабалася, і гэта была найдаражэйшая плата за працу.

Паступова адточвалася жывапіснае майстэрства. Да М. Засінца пачалі прыязджаць метадысты абласнога Дома народнай творчасці, кансультанты з Мінска. Яны арыентавалі яго на стварэнне карцін пра рэальнае, канкрэтнае жыццё, пра поспехі саўгаса, справы аднавяскоўцаў. Паралі паступіць ва Усесаюзны народны універсітэт мастацтваў. Заўсёды падтрымлівала Міхася Засінца жонка, Надзея. Яна і падрамнік змайструе, нацягне на яго палатно, пакладзе грунт, і прынясе фарбы, пэндзлі, і купіць патрэбныя кнігі па мастацтву...

І вось карціны Міхася Засінца экспануюцца на абласной выстаўцы самадзейнага мастацтва. Неўзабаве — рэспубліканская выстаўка «Слава працы» (1974). На ёй гледачы ўбачылі творы самадзейнага мастака з Гомельшчыны «Вясна», «На начлег», «Партызан». Работы прыкмецілі, адправілі на ўсесаюзную выстаўку самадзейнай творчасці. Міхась Засінец стаў лаўрэатам конкурсу самадзейнага мастацтва, быў узнагароджаны Дыпломам першай ступені. Гэтая вялікая ўзнагарода з Масквы да глыбіні душы ўзрушыла мастака, надала моцы.

М. Засінец ведаў: цяпер яго творы ацэньваў масавы глядач, спецыялісты. І, натуральна, з большай адказнасцю, патрабавальнасцю выбіраў тэмы, шукаў новага мастацка-вобразнага выражэння. Цяпер можна з упэўненасцю сказаць, што ў Засінца быў не толькі адметны мастацкі талент, але і рэдкая сіла волі, высокая ўнутраная сабранасць. Гэта быў сапраўды мужны чалавек.

Мастацтвазнаўцы, метадысты і кансультанты пастаянна трымалі ў полі зроку творчыя здабыткі М. Засінца, далікатна і асцярожна давалі парады. Прынамсі, метадычная дапамога самадзейным мастакам — справа вельмі няпростая. Як, як правіла, у асноўным ажыццяўляе Саюз мастакоў БССР, гэта значыць кваліфікаваныя прафесійныя жывапісцы ці графікі. На жаль, яны часам арыентуюць аматараў на засваенне менавіта прафесійнай граматы і тым самым міжволі садзейнічаюць таму, што ў творах страчваецца галоўнае — шчырасць, непасрэднасць, наіўная чысціня мастацкага светаўспрымання прадметнай рэальнасці. На шчасце, з творчасцю Міхася Засінца такога не здарылася, і мы маем не дзесяткі, а сотні твораў глыбокага жыццёвага і філасофскага зместу, з адметным вобразным і кампазіцыйным вырашэннем.

Першыя карціны, якія прынеслі мастаку вядомасць, ён напісаў на тэму вайны. Большасць аднавяскоўцаў М. Засінца былі ў партызанах. Як і ўсе савецкія людзі, з радасцю і слязьмі сустракалі самы светлы і радасны дзень — дзень Вялікай Перамогі. А потым — аднаўленне гаспадаркі. Старыя і дзеці, жанчыны аралі, сеялі і жалі збажыну. Засінец добра памятаў, як урэзвалася ў яго худое дзіцячае плячо вяроўка ад плуга ці бараны... Трэба было працаваць, дапамагаць калгасу, рэспубліцы ўзняцца з руін і папялішчаў... Усё перажытае самадзейны мастак імкнуўся ўвасобіць у сваіх творах. Прыгадаем, напрыклад, такія, як «Была вайна», «Партызан», «Маці. 1941—1945 гады».

У карціне «Была вайна» (1972) аўтар перадае атмасферу пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Мы не бачым баявых дзеянняў, але адчуваем вялікую небяспеку, якая пагражае нашай краіне. Прытулілася да маці, плача дзяўчынка, застаўся без аратага конь на полі, адыходзіць калона чырвонаармейцаў. Кампазіцыя набывае цэласнасць дзякуючы рытмізаванасці планаў і дэталей, зменлівасці памераў і колераў. І гэта нягледзячы на тое, што сканструявана карціна ў адной плоскасці. Усе дэталі кампазіцыі, выяўленчыя сродкі ў пэўнай ступені падпарадкаваны вытлумачэнню сімволіка-алегарычнага зместу. Недаaранае поле, конь з плугам — сімвалы мірнай хлебаробскай працы, якую перапыніла вайна; калона байцоў увасабляе згуртаванасць савецкага народа, яго непераможную моц; маці з дачкою — вялікае гора і пакуты, што прынеслі на родную зямлю ворагі. Увесь вобразна-зместавы лад кампазіцыі сведчыць, што гэта твор мастацтва так званага «прымітыву» ці «наіўнага рэалізму». Таму карціна ўзрушае гледача непасрэднасцю мастацкага бачання, шчырасцю і гранічнай душэўнай адкрытасцю.

У другім творы М. Засінца на ваен-

Маці. 1941—1945 гады. Алей, 1971.



Крынічка. Алей, 1977.



ную тэму «Маці. 1941—1945 гады» (1971) таксама прыкметныя рысы алегарычнай вобразнасці.

У большасці твораў, прысвечаных гадам вайны, Міхась Засінец адыходзіць ад апавядальна-ілюстратыўнага прынцыпу зместавай трактоўкі і будуе сюжэт, зыходзячы з абагульненых ідэйна-вобразных асноў. Гэтую адметную рысу творчай манеры мастака мы можам прасачыць у большасці яго работ на іншыя тэмы.

М. Засінец дакладна перадае атмасферу першых пасляваенных гадоў. Радасць вольнай працы пераўтвараецца ў гімн мірнаму шчасліваму жыццю. На гэтую тэму напісаны карціны «У жніво», «Весневая сяўба», «Пах спелага жыта». У кожнай кампазіцыі нязмерная любоў да жыцця, да людзей працы.

...Дзядуля прывёў хлопчыка на жытнёвае калгаснае поле, каб паказаць яму залатыя зярняты («Пах спелага жыта», 1972). Стары расказвае ўнуку пра хлеб як крыніцу жыцця на зямлі. Мастак хоча данесці да нас глыбокі філасофскі сэнс любові і пашаны да хлеба, якія перадаюцца ў народзе з пакалення ў пакаленне.

Калі М. Засінец пісаў новую карціну, то ён у думках вяртаўся на родныя палі, праходзіў між шматлікіх стагоў сена, садзіўся на трактар ці камбайн, захапляўся прасторамі саўгасных палеткаў... «Перадавікі вытворчасці», «Пераможцы сацыялістычнага спаборніцтва», «У полі», «Па шляху дзядулі і бацькі», «На сенакосе» і дзесяткі іншых яго твораў перадаюць рэальную карціну саўгасных будняў, раскрываюць чалавечыя ўзаемаадносіны. Многія гледачы, напэўна, памятаюць работу Засінца «Па шляху дзядулі і бацькі», якая экспанавалася на рэспубліканскіх і персанальнай (у 1977 годзе) выстаўках. Дзед, бацька і сын крочаць на працу. Проста, надзвычай проста. Але варта нагадаць, што самадзейны мастак з Гомельшчыны не напісаў, бадай, ніводнай карціны дзеля «малявання». У кожную ён імкнуўся закласці глыбокую думку. І ў творы, пра які ідзе гаворка, візуальнае ўспрыманне не галоўнае. Мастак імкнецца данесці да нас вялікі сэнс павагі чалавека да працы, пераемнасці сямейных працоўных традыцый.

Карціна М. Засінца «Хлеб яе ўнукаў» (1981) таксама сімволіка-алегарычная з глыбокім філасофскім падтэкстам. Бабуля з радасцю і хваляваннем прымае ад сваіх унукаў духмяны, свежавыпечаны бохан хлеба. Ці можа быць у старой жанчыны большая радасць, чым ад усведамлення таго, што дзеці і ўнукі пайшлі па яе працоўным шляху? І хлеб тут перш за ўсё — сімвал працы і жыцця. Ці, напрыклад, работа «Каля старога калодзежа» (1979). Мастак малюе каля калодзежа, пад старымі дрэвамі, людзей рознага ўзросту, каб расказаць пра сілу сокаў роднай зямлі, той крыштальнай вадзіцы, якая дае пачатак усяму жываму ў прыродзе. Прыкладна такі ж змест і ў карціны «Крынічка» (1977).

У некаторых работах М. Засінца ёсць масавыя сцэны. Напрыклад, ён увасабляе ўрачыстае віншаванне пераможцаў сацыялістычнага спаборніцтва, малюе даярак, якія ідуць на ферму, працу ў полі, адпачынак сваіх аднавяскоўцаў. Падрабязная дэталёвая распрацоўка кампазіцыі, між іншым, не пазбаўляе творы цэласнасці, мастацкай завершанасці. Самадзейныя мастакі, у тым ліку і М. Засінец, імкнуцца змясціць на палатне максімум прадметаў і робяць гэта з поўнай перакананасцю, што гэта дапаможа расказаць пра факт, эпізод ці падзею найбольш праўдзіва. Менавіта прадметную інфармацыю з яе максімальна рэалістычнай афарбоўкай мастакі-аматары лічаць самай важнай і адказнай справай. Колеравая распрацоўка, хоць і адыгрывае важную ролю, усё ж адыходзіць на другі план і ў кампазіцыі твора часцей выконвае дапаможную функцыю.

У карцінах М. Засінца часта з'яўляюцца лірычныя матывы. Мастак увасабляе і бытавыя сцэнкі, прыгадвае эпізоды са свайго дзяцінства і юнацтва, абагульняе, выразна вырашае іх. Згадаем тут «Бабуліны казкі», «Бярозавік», «За аколіцай», «Паспела рабіна», «Зацвіла чаромха» і цэлы шэраг іншых.

М. Засінец вельмі тонка адчувае прыроду і здолеў з сардэчнай цеплынёй перадаць у пейзажах сваё захапленне рознымі яе праявамі. Кранаюць шчырасцю, уражваюць «Залатая сажалка», «Новы ўраджай», «Ружовая раніца», «Буслы»... Ярка-барвовы каларыт апошняга з названых твораў, які, можа, і не быў характэрным для жывапіснай манеры Засінца, тут дакладна перадае летнюю гарачыню. Мы бачым маленькі фрагмент звыклага беларускага краявіду: на скошаным лузе сярод невысокіх стройных бяро-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУ



На начлег. Алей. 1971.

Каля магазіна. Алей, 1975



зак і копаў сена спацыруюць буслы.

«Ружовую раніцу» можна лічыць і жанравай карцінай. Дзяўчынка нібы ўздымае заслону, і перад нашымі вачыма адкрываецца карціна абуджэння прыроды ад начнога сну.

Сярод пейзажаў мастака ёсць і карціны драматычнага настрою, філасофскага зместу. Нагадаем некаторыя з іх: «Вясёлка над вёскай», «Дрэва жыцця», «Парасткі» і іншыя. Чалавек у гэтых творах успрымаецца як арганічная частка і вышэйшая праява прыроды.

Ёсць сярод твораў М. Засінца некалькі партрэтаў. Гэта «Партрэт бабулі», «Аўтапартрэт», «Мужчынскі партрэт», «Даярка». Мастак імкнуўся зазірнуць у душу чалавека, перадаць адметнасць асобы. І гэта ў пэўнай ступені ён здолеў зрабіць.

Нацюрморты М. Засінец таксама пісаў не дзеля «знешняй прыгажосці». Ён ставіў мэтай раскрыць пэўны змест праз канкрэтна зададзеныя суадносіны прадметаў, часта звязваў іх з фрагментамі пейзажу. Такі прынцып кампазіцыйнага вырашэння дазваляў паглыбіць думку пра сутнасць рэчаў і прадметаў, завастрыць увагу на іх месцы ў прыродзе і жыцці чалавека (работы «Галінка вярбы», «Нацюрморт з чаем»).

Да Міхася Засінца часта прыязджалі мастацтвазнаўцы і карэспандэнты. Неаднойчы даводзілася наведваць мастака і мне. Але хочацца згадаць першую нашу сустрэчу.

...Каб трапіць у вёску Мядзведнае, давялося ехаць да Гомеля, затым да Ельска, дабірацца да вёскі Скароднае — цэнтра саўгаса, нарэшце, адмераць яшчэ кіламетраў пяць пешшу. Спытаўся ў вяскоўцаў, дзе жыве Засінец. А яны пачалі меркаваць, які ж Засінец (у Мядзведным больш за палову такіх прозвішчаў). І толькі калі ўдакладніў, што ён мастак, жывапісец,— сказалі, дзе стаіць яго хата. Памятаю, калі праходзіў па вуліцах, завулках, усё хацеў адшукаць «залатую сажалку», якую ўвасобіў М. Засінец у адным са сваіх твораў...

Хата Міхася Засінца крыху ўбаку ад цэнтра вёскі. Ужо здалёк былі відаць яе блакітныя ліштвы. Я зайшоў у пакой. У ложку з высокімі падушкамі ляжаў Міхась Засінец. Павіталіся. «Не чакаў я, ніхто мяне не папярэдзіў»,— сказаў ён разгублена. Некалькі хвілін мы маўчалі. Няпроста было пачаць гаворку... Потым усё ж разгаварыліся. Я даўно марыў сустрэцца з мастаком, шмат пра што хацеў у яго папытаць. Тым часам у хаце паціху збіраліся людзі. Прыйшлі маці Засінца (яна жыве на другім канцы вуліцы), жонка, брат. На двары гаманілі суседзі. Я разумеў, што гэтыя людзі жывуць адзінымі справамі, адзінымі клопатамі, радасцямі. Да іх Міхася прыехаў невядомы, чужы чалавек! Таму ўсе і заспяшаліся сюды, цікавяцца...

Доўга мы гутарылі з Засінцом, гаварылі пра самадзейнае мастацтва, абмяркоўвалі новыя творы.

Па дарозе ў Мінск, памятаю, шмат перадумаў пра розныя чалавечыя лёсы, пра Міхася Засінца... Як суіснуюць у яго душы трагічнае і аптымістычнае, жыццесцвярджальнае? Ён, як ніхто, любіць жыццё, людзей, умее аддаваць цяпло сваёй душы іншым. І яго асабістыя душэўныя якасці — высакароднасць, сціпласць, адкрытасць і дабрыня ўвасабляюцца ў жывапісных творах. Я прыгадваў «Ля старога калодзежа», «Вяснянкі», «Партрэт бабулі», «Пакаленне», «Сям'я ў хаце», «Хлеб яе ўнукаў»... Мовою выяўленчага мастацтва аўтар перадае ў іх перш за ўсё свае адносіны да зямнога быцця, дзе ёсць і радасць людская і гора, дзе ўзыходзіць, свеціць сонца і надыходзіць начная цемра.

А Міхась Засінец сумняваўся ў сваіх мастацкіх здольнасцях. «Ды які я жывапісец,— казаў,— па рэпрадукцыях карцін сапраўдных мастакоў бачу, што ў мяне выходзіць не так. Не прыйшлося мне па-сапраўднаму вучыцца выяўленчай грамаце. А тое, чаму навучыўся ў творчасці, дык гэта ж сам ад сябе. Як атрымліваецца, так і малюю».

Варта сказаць, што выкладчыкі Усесаюзнага завочнага народнага універсітэта мастацтваў, якія выхоўвалі мастацкую культуру М. Засінца, не парушылі, збераглі яго лепшыя прыродныя якасці, талент сапраўднага народнага жывапісца. Пра гэта клапаціліся і метадысты, кансультанты. Часам у арганізацыйна-метадычных установах можна было пачуць: «Самадзейных мастакоў у нас шмат, а Засінец — адзін». Сапраўды, у творчасці Міхася Засінца выявіліся рэдкая самабытнасць, непаўторнае мастацкае бачанне, блізкае да традыцый і канонаў эстэтычнага светаўспрымання. У жывапісе ён ішоў па шляху інтуітыўнага вобразнага ўяўлення прадметнай рэальнасці. Адсюль і непаў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Залатая восень. Алей, 1974.



На шляху дзядулі і бацькі. Алей, 1973.



торнасць, своеасаблівасць яго твораў. Карціны М. Засінца гледачы пазнавалі адразу. Яны вабілі чысцінёй і свежасцю каларыту, жыццесцвярджальнай апавядальнасцю, сардэчнай дабрынёй да ўсяго зямнога, пераканаўчаю вераю ў добрае, светлае. На жаль, жыццё М. Засінца абарвалася якраз тады, калі быў выпрацаваны свой жывапісны почырк, калі прыйшло майстэрства.

Але мастак застаўся ў чалавечай памяці. Ведаю, у саўгасе, раёне яго паважалі, ім ганарыліся. Казалі: «Гэта наш Паўка Карчагін». Нельга не згадаць, што адміністрацыя, партыйная арганізацыя саўгаса, а таксама сельскі Савет клапаціліся пра Міхася Засінца. Яму персанальна і, бадай што, адзінаму ў вёсцы падвялі тэлефон, дапамагалі палівам, кормам для жывёлы. Як камуніста і члена саўгаснай партыйнай арганізацыі рэгулярна інфармавалі пра вынікі партыйных сходаў, рашэнні партбюро. І ён, як мог, хацеў аддзячыць за клопаты і дапамогу: дарыў карціны мясцовым школам, саўгасу, апяваў у творах жыццё і справы людзей працы, сваіх аднавяскоўцаў.

За вялікія дасягненні ў выяўленчым мастацтве і плённую працу па эстэтычнаму выхаванню працоўных у 1977 годзе М. Засінцу было нададзена званне заслужанага работніка культуры БССР.

Міхася Засінца, жывапісца з багатым уяўленнем і прыродным талентам каларыста, добра ведалі не толькі ў нашай рэспубліцы, але і па ўсёй краіне. Яго лепшыя творы экспанаваліся на перасовачных мастацкіх выстаўках у Балгарыі, Венгрыі, ГДР, Чэхаславакіі і іншых краінах.

На ўсіх усесаюзных выстаўках, якія адбыліся ў рамках першага і другога ўсесаюзных фестываляў самадзейнай мастацкай творчасці (1977 і 1981 гады), Міхась Засінец атрымліваў званні лаўрэата, яго ўзнагароджвалі залатымі медалямі, Ганаровымі граматамі і дыпломамі. Не адну сотню самых сардэчных слоў пакінулі ў кнігах водгукаў гледачы. Пра яго творчасць шмат пісалі на старонках усесаюзных і рэспубліканскіх часопісаў і газет. Выдавецтва «Беларусь» выпусціла ў свет манаграфію «Міхась Засінец». На кінастудыі «Беларусьфільм» была створана стужка пра самадзейнага мастака. Не раз звярталася да яго карцін тэлебачанне...

Які ж лёс шматлікіх твораў М. Засінца? Частка работ куплена Дзяржаўным і Мастацкім музеямі БССР. Пэўная колькасць карцін засталася ў Маскве ў фондах Усесаюзнага завочнага універсітэта мастацтваў імя Н. К. Крупскай. Асноўная ж большасць твораў знаходзіцца, як кажуць, у сямейным архіве. З цягам часу яны могуць разысціся па свеце, згубіцца. На наш погляд, трэба было б, пакуль не позна, паклапаціцца пра зберажэнне карцін Міхася Засінца. У нас ёсць Саюз мастакоў БССР, Мастацкі фонд БССР, Рэспубліканскі навукова-метадычны цэнтр народнай творчасці, краязнаўчыя музеі. Гэта ўстановы і арганізацыі, якія маглі б набыць творы жывапісца і гарантаваць іх зберажэнне. Варта ў бліжэйшыя год-два сабраць работы М. Засінца на пасмяротную персанальную выстаўку ў Мінску. Тады можна было б весці канкрэтную гаворку пра наяўнасць карцін і далейшы іх лёс.

Няхай жа цяпло чалавечага сэрца, аптымізм, хараство зямнога быцця, так шчыра і пераканаўча ўвасобленыя ў жывапісных палотнах Міхася Засінца, абудзяць лепшыя пачуцці кожнага, хто сустрэнецца з творамі самадзейнага мастака, майстра непаўторнай вобразнай мовы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ